ЧАЦВЁРТАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

# Прамова дэпутата Ц. Я. Кісялёва

## на пасяджэнні Совета Нацыянальнасцей 27 снежня

(Кобрынская выбарчая акруга, Беларуская ССР)

Таварышы дэпутаты! Праект Дзяржаўнага бюджэту, разглядаемы намі, адлюстроўвае клопаты Комуністычнай партыі і Совецкага Урада аб умацаванні магутнасці соцыялістычнай дзяржавы, саюза рабочага класа і калгаснага сялянства, дружбы народаў СССР.

Праект бюджэту адлюстроўвае карэнныя інтарэсы працоўных. У ім прадугледжан далейшы рост соцыялістычнай прамысловасці, і перш за ўсё цяжкай індустрыі — асновы ўсёй нашай эканомікі. Праект прадугледжвае таксама новы ўздым усіх галін сельскай гаспадаркі, лёгкай і харчовай прамысловасці, павелічэнне вытворчасці тавараў народнага спажывання. Усё гэта будзе садзейнічаць далейшаму паляпшэнню матэрыяльнага добрабыту совецкага народа.

У праекце Дзяржаўнага бюджэту яскрава адлюстравана міралюбівая знешняя палітыка Совецкай дзяржавы. Совецкі Саюз паслядоўна і няўхільна адстойвае справу міру ва ўсім свеце. Совецкія людзі хочуць жыць у міры і дружбе з народамі ўсіх краін. Мудрая ленінская знешняя палітыка Совецкай дзяржавы заваявала прызнанне ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. Яскравым праяўленнем гэтай палітыкі з'явілася паездка таварышаў Нікалая Александравіча Булганіна і Нікіты Сергеевіча Хрушчова ў Індыю, Бірму і Афганістан. Совецкія людзі з вялікай увагай і радасцю чыталі паведамленні аб гэтай паездцы.

Сэрцы совецкіх людзей поўныя пачуцця законнай гордасці і радасці за нашу магутную Радзіму, за слаўную Комуністычную партыю і Совецкі Урад, за кіраўнікоў Совецкай дзяржавы, якія па-ленінску вырашаюць пытанні знешняй палітыкі. Совецкі народ горача і аднадушна адабрае вынікі паездкі таварышаў Булганіна і Хрушчова ў Індыю, Бірму і Афганістан. Гэтыя вынікі радуюць не толькі нас, совецкіх людзей. Яны радуюць усіх сумленных людзей за рубяжом, усіх, каму дарагі мір, бяспека, дружба і супрацоўніцтва народаў.

Таварышы дэпутаты! У сваім дакладзе Міністр фінансаў СССР дэпутат Зверэў гаварыў аб тых вялікіх поспехах, якіх дабіўся совецкі народ пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі і Совецкага Урада ва ўздыме ўсіх галін народнай гаспадаркі. Пэўных поспехаў у перыяд паміж другой і трэцяй сесіямі Вярхоўнага Совета СССР дабіліся і працоўныя Совецкай Беларусі.

Цэнтральны Камітэт нашай партыі, Совецкі Урад штодзённа праяўляюць клопаты аб развіцці народнай гаспадаркі Беларусі і аказваюць рэспубліцы вялікую дапамогу. Выконваючы гістарычныя пастановы Пленумаў ЦК КПСС па пытаннях далейшага ўздыму народнай гаспадаркі, працоўныя Беларусі ў 1955 годзе дабіліся некаторага паляпшэння работы прамысловасці. Датэрмінова выканан план 1955 года і ў цэлым другі пасляваенны пяцігадовы план. Аб'ём прамысловай вытворчасці ў параўнанні з 1954 годам узрос на 13,5 працэнта. Павысілася прадукцыйнасць працы, большасць прадпрыемстваў дабілася зніжэння сабекошту выпускаемай прадукцыі. Больш рацыянальна выкарыстоўваюцца абсталяванне і існуючыя вытворчыя плошчы. Аднак наяўныя магчымасці павелічэння выпуску прамысловай прадукцыі, зніжэння яе сабекошту і павышэння якасці яшчэ далёка не выкарыстаны.

Некаторыя станоўчыя вынікі дасягнуты і ў развіцці сельскай гаспадаркі рэспублікі. Калгаснікі, работнікі МТС і соўгасаў Беларусі настойліва змагаюцца за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў Пленумаў ЦК партыі па крутому ўздыму сельскай гаспадаркі. Разгарнуўшы соцыялістычнае спаборніцтва ў гонар XX з'езда КПСС, працаўнікі вёскі больш арганізавана правялі сельскагаспадарчыя работы, датэрмінова выканалі дзяржаўны план нарыхтовак збожжа, бульбы, гародніны, пладоў. Датэрмінова выканан дзяржаўны план нарыхтовак ільноваланна. На 20 снежня

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы